сучаснасцю і біяграфічным часам (маральна-этычная сфера): актуальнасць пастаўленых пытанняў; 7) сімвалізм часава-прасторавых элементаў паглыбляе псіхалагічную напружанасць і насычанасць дзеяння, не адрываючы яго ад рэчаіснасці; 8) часава-прасторавая шматузроўневасць не перашкаджае чытачу успрымаць твор, а паляпшае глыбіню гэтага ўспрымання. Гэта сведчыць аб майстэрстве сюжэтабудавання пісьменніка.

Такім чынам, В. Быкаў з дапамогай своеасаблівай рэалізацыі катэгорый часу і прасторы стварае сапраўды антываенны пафас у аповесці «Жураўліны крык», сцвярджаючы перамогу высокіх маральных каштоўнасцяў над амаральнасцю вайны.

**Спіс выкарастаных крыніц і літаратуры**

1. Быкаў, В. Збор твораў у 4-х т. / В. Быкаў; т. I. Аповесці. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1980.

## ТАВАРНА-ГРАШОВЫЯ ЗНАКІ І ДАКУМЕНТЫ «ЦЭНТРАЛЬНАГА ГАНДЛЕВАГА ТАВАРЫСТВА ДЛЯ УСХОДУ» НА АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1941–1944 гг.

***Калясінскі В.Ф.***
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтва»,
г. Мінск

Надышла дата 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, якая прынесла вялікія выпрабаванні для ўсяго савецкага народа. Асабліва пацярпела Беларусь, насельніцва якой у час акупацыі панесла цяжкія чалавечыя і матэрыяльныя страты. Дэстабілізацыя эканомікі вымушала частку насельніцтва пераходзіць да натуральнай гаспадаркі. Пры адсутнасці тавараў першай неабходнасці расквітнела спекуляцыя.

На акупаванай тэрыторыі Беларусі знаходзіліся ў абарачэнні некалькі відаў валют. Працягвалі абарочвацца папяровыя і металічныя грошы СССР, якія карысталіся ў насельніцтва даверам, былі аб'яўлены законным плацёжным сродкам ваенныя грошы – акупацыйныя маркі, якія абарочваліся да канца вайны і наносілі насельніцтву матэрыяльную шкоду, траплялі ў абарот германскія рэйхсмаркі, якія патрэбна было обменьваць на акупацыйныя грошы. Да ваенных грошаў адносіліся і дробныя разменныя манеты з цынкавага сплаву.

На частцы тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад кіраўніцтвам грамадзянскай акупацыйнай адміністрацыі і ўключала Мінскі, Слуцкі, Ганцавіцкі, Слонімскі, Баранавіцкі, Навагрудскі, Лідскі, Вілейскі і Глубокскі паветы, была створана генеральная акруга «Беларусь». Яна разам з генеральнымі акругамі «Літва», «Латвія» і «Эстонія» ўваходзіла ў Рэйхскамісарыят «Остланд» з адміністрацыйным цэнтрам у Рызе.

У 1943–1944 гг. у геніральнай акрузе «Беларусь» нямецкая акупацыйная адміністрацыя з мэтай удасканальвання грашовых разлікаў, а таксама каб павялічыць здачу насельніцтвам прадуктаў харчавання і сыравіны, была вымушана ўвесці ў карыстанне таварно-грашовыя «Знакі пунктавай вартасці прадзільных вырабаў».

На паліграфічнай фабрыцы каштоўных папер у Рызе для ўсіх генеральных акруг рэйскамісарыяту «Остланд» і акругі «Усход», у якую уваходзілі часткі Ленінградскай і Пскоўскай вобласцей Расіі, былі распрацаваны і надрукаваны таварна-грашовыя «знакі пунктавай вартасці прадзільных вырабаў» наміналам у адзін, тры, пяць і дзесяць тэкстыльпунктаў, з тэкстамі на нямецкай і нацыянальных мовах.

Тэкстыльпункты былі надрукаваны на белай паперы памерам 73x132 мм і мелі аднабаковую арыентацыю. У мерах абароны ад падробак выкарыстоўваліся вадзяныя знакі. Ліцавы бок меў сваю афарбоўку. «1 тэкстыльпункт» меў ружовы колер; «3 тэкстыльпункты» – зялёны; «5 тэкстыльпунктаў – жоўты» і « 10 тэкстыльпунктаў – таксама зялёны колер». Край тэкстыльпунктаў быў не крануты коляром. Дызайн усіх тэкстыльпунктаў меў падабенства. Невялікія адрозненні ў дызайну былі характэрны для розных генеральных акруг і эміссій для іх.

Беларускіх тэкстыльпунктаў выяўлены тры эмісіі. Нумары на некаторых тэкстыльпунктах былі праштампаваны нумаратарамі са значком «№», на некаторых сустракаюцца без гэтага значка. Сустракаюцца нумары, напісаныя алоўкам ад рукі. Выдаваліся на рукі тэкстыльпункты і без нумароў, што можна тлумачыць тым, что яны знаходзіліся ў больш пазнейшай партыі, калі ўжо не вёўся ўлік нумароў. Такім чынам, першыя партыі былі з нумарамі, а пазнейшыя па часе – без нумароў. Сустракаюцца тэкстыльпукты ўжо пагашаныя – з адарванымі правымі вуглаамі.

Тэкстыльпунктамі прэміравалі гаспадароў за здачу паставак сяльгазвытворчасці звыш нормы. На адваротным баку тэкстыльпуктаў быў вызначаны асартымент прадзільных вырабаў і прыклады для ацэнкі ў пунктах.

За кожную колькасць здадзенага сельскагаспадарчага прадукта пастаўшчыкам залічвалася на пакупных талонах вызначаная колькасць пунктаў.

Для інфармацыі насельніцтва аб таварных прэміях у рыжскай тыпаграфіі на мовах карэннага насельніцтва генеральных акруг Рэйхскамісарыята «Остланд» (беларускай, латышскай, літоўскай, эстонскай), таксама і на расійскай мове былі надрукаваны расцэнкі сельскагаспадарчых тавараў на пункты. Яны неслі інфармацыю аб суадносінах цаны ў тэкстыльпунктах на тавары ў той, альбо іншы час.

Цікава азнаёміцца з цыркулярам «Таварная прэмія за здачу абавязковых пастачаў». Цыркуляр пачынаецца наступным заклікам – *«Сяляне, здавайце ў назначаных тэрмінах Вашы абавязковыя пастачы за 1943 – 1944 гаспадарчы год. Тады Вы будзеце мець магчымасць у крамах Цэнтральнога Гандлёвага Таварыства закупіць такія прадметы першай патрэбы, як соль, махорка, папяросы, нафта, гарэлка, сельска-гаспадарчыя прылады, тэкстыльныя тавары і г. д.»*

Далей цыркуляр інфармаваў па наступных пытаннях:

- Тэрмін здачы абавязковых пастачаў;
- Расцэнка сельскагаспадарчых прадуктаў на пункты;
- Расцэнка прэміёвых тавараў на пункты.

Кожны гаспадар павінен быў мець план абавязковай здачы сельскагаспадарчай прадукцыі і меў на руках таварную картку, у якой адзначалася здадзеная колькасць пастачаў. Астатнюю частку прадукцыі, якая заставалася пасля выканання плана зда-чы, што было зафіксавана ў картцы, можна было рэалізаваць на рынку ў свабодным продажы.

Напрыклад, таварная картка «Цэнтральнага Гандлёвага Таварыства для Усходу» для Мінскага павета мела «Тлумачэнне да таварных картаю», у якім гаварылася натупнае:

*«Таварная картка выдаецца на імя селяніна без права перадачы яе. Кожная пастаўка селянінам прадуктаў павінна адзначацца на таварнай картцы ў павятовай канторы, і пры выкананні кожнага асобнага віду прадуктаў робіцца адзнака ў графе «выканана» і замацоўваецца подпісам і пячаткай. Гэта адносіцца таксама да паставак, здадзеных звыш норм. На кожную колькасць здадзенага сельскагаспадарчага прадукта пастаўшчыку залічваецца на пакупных талонах вызначаная колькасць пунктаў. Пасля выканання паставак пастаўшчык пры прадстаўленні таварнай карткі і адмечаных пунктах на тавары можа купіць тавары шырокага спажывання ў магазінах Ц.Г.Т.*

*Гэтыя тавары таксама нарміруюцца пунктамі. Напрыклад, за пастаўку аднаго цэнтнера збожжа залічваецца 75 пунктаў, адзін серп ацэньваецца ў 75 пунктаў. Здача звыш пастаўкі прэміруецца падвойным лікам пунктаў.*

*Таварная картка таксама з'яўляецца пасведчаннем для селяніна пры продажы яго сельска-гаспадарчых прадуктаў на адкрытым рынку.*

*Да продажы на рынку дапускаюцца толькі тыя асобы, у картках якіх подпісам і пячаткай павятовай канторы адзначана выкананне прадаваемага віду прадуктаў.*

*Згубленыя таварныя карткі могуць быць аднаўлены толькі пасля падрабязнай і дэталёвай праверкі факту прапажы Крайслядвіртам».*

Акрамя таварных картак, сяляне мелі асаблівыя разліковыя кніжкі па абавязковай пастаўцы яек, выдадзеныя «Цэнтральным Гандлёвым Таварыствам для Ўсходу» ў Менску. У гэтых кніжках пазначалася колькасць здадзеных яек па месяцах і заданне на здачу ў штуках.

Акрамя абавязку здаваць усе планавыя пастачы сельскагаспадарчай прадукцыі, сяляне павінны былі плаціць самаабкладнёвы і будынковы падатак германскімі акупацыйнымі грашыма. Аб гэтым, напрыклад, сведчыць плацёжнае паведамленне Клецкага павятовага фінансавага аддзела за 1942 г. – самаабкладнёвы падатак складаў 12 рэйхсмарак, а будынковы 5 рэйхсмарак і 40 пфенінгаў.

Такім чынам, таварна-грашовыя «знакі пунктавай вартасці прадзільных вырабаў» і іншыя фінансавыя дакументы з'яўляюцца сведкамі гісторыі і эканамічных адносін у гады нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Орлов, А.П. Бумажные денежные знаки в Беларуси / А.П. Орлов. – Мн.: Минская фабрика цветной печати, 2008. – 696 с.: ил.

2. Орлов, А.П. Оккупационные деньги в Беларуси / А.П. Орлов // Банковский вестник. – 2003. – № 31.

3. Пазднякоў, В.С. Папяровыя грошы Беларусі: ад XVIII ст. да нашых дзён / В.С. Пазднякоў; маст. В.У. Галаванаў. – Мн.: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 687 с.

## ТУРЦИЯ В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

***Кобрин М.В.***
УО «Барановичский государственный университет», г. Барановичи

Турция формально пыталась сохранить нейтралитет. Но и на территории этого государства разворачивалось сражение, правда, невидное для глаз посторонних. Где-то далеко шла война, а в безмятежном Стамбуле все было как обычно – из установленных на столбах "колокольчиков" звучала песня восходящей звезды эстрады Музиен Сенар. На босфорской пристани рыбаки выкладывали свой утренний улов: маленькие сладкие ставридки. Мальчишки в поисках мидий ныряли с причала, дюкканщики открывали свои лавочки и, оставив их на попечение малолетних помощников, с раннего утра отправлялись в близлежащую чайную, чтобы провести весь день в политических дискуссиях. На страницах газет ежедневно публиковали военные сводки. Всех волновало, не вступит ли Турция во вторую мировую войну, а если это произойдет, то на чьей стороне. О союзнических отношениях с Советской Россией не могло быть и речи – коммунизма боялись больше, чем нацизма.